III ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП БЕЛАРУСІ

# АБ ВЫНІКАХ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І ЗАДАЧАХ ПА ДОГЛЯДУ ПАСЕВАЎ, ПРАВЯДЗЕННЮ ЎБОРКІ І НАРЫХТОВАК СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З дакладам «Аб выніках веснавой сяўбы і задачах па догляду пасеваў, правядзенню ўборкі і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў» выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, міністр вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў БССР тав. **У. Е. Лабанок.**

Партыйная арганізацыя нашай рэспублікі, гаворыць ён, ажыццяўляючы рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС, указанні і парады таварыша М. С. Хрушчова, правяла вялікую палітычную і арганізатарскую работу па падрыхтоўцы і правядзенню веснавой сяўбы. Зроблен першы крок па ліквідацыі травапольля, па паляпшэнню выкарыстання зямлі. Распрацавана новая структура пасяўных плошчаў, у якой прадугледжана рэзкае расшырэнне пасеваў кукурузы, цукровых буракоў, зернебабовых. У гэтым годзе пад яравыя культуры вывезена на 12 мільёнаў тон больш угнаенняў, чым у мінулым годзе. Ў сярэднім на гектар пасеваў унесена па 14 тон угнаенняў. Значна ўзрасла тэхнічная аснашчанасць калгасаў і саўгасаў. Дастаткова сказаць, што толькі трактарны парк павялічыўся на 4.200 машын, або на 13,5 працэнта. Лепш навучаны кадры перадавым метадам вырошчвання кукурузы, цукровых буракоў, бабовых і іншых культур.

Выключна важнае значэнне, гаворыць далей тав. Лабанок, набывае цяпер арганізацыя ўзорнага догляду пасеваў. У гэтым годзе, калі многія культуры пасеяны на вялікіх плошчах са спазненнем, а моцныя апаўдкі і паніжаныя тэмпературы ў маі — чэрвені стварылі ўмовы, пры якіх пустазелле апярэджвае развіццё культурных раслін, лёс ураджаю залежыць перш за ўсё ад таго, як будзе арганізаваны догляд пасеваў.

Многія кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, тэрытарыяльныя ўпраўленні не стварылі патрэбнай напружанасці ў арганізацыі работ па правядзенню догляду пасеваў. Асабліва нецярпіма спазненне з апрацоўкай пасеваў цукровых буракоў, дзе літаральна кожны ўпушчаны дзень вядзе да зніжэння ўраджаю.

У многіх калгасах і саўгасах на значнай частцы плошчаў, асабліва позняй сяўбы, не праведзены шароўка, прарыўка цукровых буракоў. Гэтых работ ні ў якім разе нельга далей зацягваць.

Асабліва старанна неабходна даглядзець кукурузу. Вельмі важна там, дзе гэта яшчэ не зроблена, прабаранаваць пасевы да з'яўлення ўсходаў. Наступнае баранаванне па ўсходах можна праводзіць тады, калі на раслінах з'явяцца 2—3 лісты. За гэтым трэба строга прасачыць, інакш можна прына Гродзеншчыне не засталіся б на зіму неабмалочанымі збожжавыя з 62 тысяч гектараў, з-за чаго вобласць страціла збожжа прыкладна столькі ж, колькі здала дзяржаве.

У гэтым годзе калгасам і саўгасам трэба будзе ўбраць звыш 1.300 тысяч гектараў працаёмкіх прапашных культур — кукурузы, бульбы, цукровых буракоў. Гэта запатрабуе вялікага напружання ўсіх сіл і сродкаў калгасаў і саўгасаў. Вось чаму важна прыняць усе меры да таго, каб работы па перабленню, абмалоту, рассцілу льну і ўборцы збожжавых культур былі завершаны да пачатку ўборкі кукурузы і бульбы, гэта значыць не пазней як у сярэдзіне жніўня.

Да пачатку ўборкі ўраджаю засталося нямнога часу. Аднак падрыхтоўка да гэтага адказнага перыяду сельскагаспадарчых работ вядзецца пакуль вельмі марудна. Многія гаспадаркі па сутнасці не распачалі рамонту тэхнікі, не рыхтуюць свірнаў, такоў, сушылак.

Цяпер патрабуецца выключна напружаная работа механізатараў, рамонтных рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, каб на працягу месяца падрыхтаваць усю ўборачную тэхніку. Вялікая адказнасць за гэту справу кладзецца на кіраўнікоў аб'яднання «Белсельгастэхніка», якія абавяМала бываюць на месцах і галоўныя спецыялісты ўпраўлення.

Нямала недахопаў ёсць і ў практыцы кіраўніцтва вытворчымі ўпраўленнямі з боку абласных арганізацый. Ва ўпраўленні пасылаецца вельмі многа папер. Так, Мінскае вытворчае ўпраўленне атрымала толькі ў маі 118 дырэктыў, у тым ліку ад абласнога ўпраўлення вытворчасці і нарыхтовак 32 паперы, аблвыканкома — 18 і г. д. За адзін дзень 1 чэрвеня ва ўпраўленне паступіла 15 дакументаў. Трэба рашуча скараціць гэты бюракратычны паток папер і забяспечыць практычную дапамогу вытворчым упраўленням у арганізацыі іх работы.

Дакладчык гаворыць аб вялікіх магчымасцях, якія маюць тэрытарыяльныя вытворчыя ўпраўленні для паляпшэння сваёй работы, аб адказных задачах, якія стаяць перад імі. Яны павінны прыняць практычныя меры, каб забяспечыць у кожным калгасе і саўгасе няўхільны рост вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў і зніжэнне іх сабекошту. Многае трэба будзе зрабіць па ўкараненню ўнутрыгаспадарчага разліку, упарадкаванню нарміравання і аплаты працы, ужыванню дадатковай аплаты працы ў калгасах, укараненню ў саўгасах акордна-прэміяльнай сістэмы аплаты працы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы